ПРАВАВАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

# Сексуалізаваны харасмент у беларускай грамадзянскай супольнасці за мяжой



© Прававая ініцыятыва, 2024

# Змест

Уводзіны ... 3
Як эміграцыя і агульная мэта ўплываюць на праблему? ... 4
Чаму варта казаць пра гэта заўсёды? ... 4
Метадалогія ... 5
Аналіз адказаў анлайн-формы ... 8
Аналіз глыбінных інтэрв'ю ... 14
Гендарныя дысбалансы ... 15
Асноўныя праявы харасменту ... 15
Улада і ўразлівасць ... 16
Эміграцыя як абцяжарвальны фактар ... 16
Сацыяльная рэакцыя і бяссілле ... 17
Прычыны маўчання жанчын ... 18
Рэкамендацыі па змене сітуацыі ад рэспандэнтак ... 18
Аналіз харасменту: прычыны, узаемасувязь з сацыяльнымі структурамі, праз меркаванні экспертак са сферы абароны правоў жанчын ... 21
Карані праблемы ... 22
Іерархіі і знечалавечванне ... 24
Сацыяльныя стэрэатыпы і роля жанчыны: аснова для дамаганняў ... 24
Культура гвалту і нармалізацыя харасменту ... 24
Чаму жанчыны маўчаць пра харасмент? ... 25
Як няроўнасць узмацняе харасмент ... 26
Высновы і рэкамендацыі ... 26

# Уводзіны

*Чаму праблема харасменту актуалізавалася менавіта цяпер?*

Вясной 2024 года Наста Базар стала ініцыятаркай марша «Памяці Лізы» і хэштэга

#ХопіцьГвалціць11 пасля выпадку згвалтавання, якое прывяло да смерці беларускі. Гэты

хэштэг ператварыўся ў беларускі аналаг #MeToo, дзе жанчыны пачалі дзяліцца сваімі гісторыямі пра фізічны і сексуалізаваны гвалт, а потым з'явіліся сведчанні пра харасмент у розных сферах беларускага грамадства, у тым ліку за мяжой.

На наш погляд, абмеркаванне тэмы харасменту стала актуальным праз трансфармацыю сацыяльных і гендарных роляў у беларускім грамадстве пасля масавай эміграцыі. Беларуская супольнасць за мяжой апынулася ў новай рэальнасці, дзе ціск традыцыйных сацыяльных нормаў аслабеў, а глабальная павестка пра правы чалавека і гендарную роўнасць стала бліжэй за кошт таго, што большасць беларусак і беларусаў знаходзяцца ў еўрапейскіх краінах, дзе правы чалавека выконваюцца ў большай ступені, чым у Беларусі да 2020 года. Эміграцыя стварыла прастору для пераасэнсавання асабістых межаў, адносінаў улады і культурных стэрэатыпаў, што дазволіла многім упершыню ўсвядоміць праблему харасменту.

Мы адзначаем, што менавіта ў эміграцыі пачалі гучаць галасы жанчын, гатовых абмяркоўваць гвалт і маніпуляцыі праз агучванне сваіх гісторый.[2] Аднак некаторыя з іх сутыкаюцца з супрацівам унутры супольнасці, што звязана з двума асноўнымі фактарамі:

1. Патрыярхальныя ўстаноўкі: у беларускай культуры гістарычна ўкаранілася ўяўленне, што абмеркаванне гвалту або харасменту – тое ж самае, што і публічна выносіць «бруд з хаты» і шкодзіць рэпутацыі. Гэтая праблема існавала да масавай эміграцыі і застаецца цяпер.
2. Агульныя мэты рэвалюцыйнай супольнасці: беларуская эміграцыя чацяком аб'яднаная ідэяй барацьбы з рэжымам і надзеяй вярнуцца дадому, што прадугледжвае сумесную працу актывістаў/ак незалежна ад іх асабістых паводзінаў. Гэта стварае своеасаблівую «культуру маўчання», дзе праблематыка харасменту адсоўваецца на другі план дзеля адзінства ў барацьбе.[3]

---

[1] https://news.zerkalo.io/life/62829.html

[2] Заява «Нашай Нівы» пра сітуацыю хатняга гвалту: https://nashaniva.com/338127
Выпуск Ютуб-шоу «Максимально» пра хатні гвалт: https://www.youtube.com/watch?v=EyRA6czwxOg

[3] Шоу Еўрарадыё: «Пра тое, чаму Новую Беларусь не пабудаваць без прыняцця гендарнай роўнасці, як пазбавіць беларускае грамадства патрыярхальнасці і пра ролю гісторыі ў фармаванні гэтай патрыярхальнасці мы і разважаем у праграме «Ідэя Х» з Настай Базар»: https://euroradio.fm/bazar-mova-shanavanne-byloga-zmeny-dzelya-buduchyni-takoy- bachu-nashu-ideyu

## Як эміграцыя і агульная мэта ўплываюць на праблему?

У эміграцыі беларуская грамадзянская супольнасць сутыкнулася з новымі ўмовамі, дзе сацыяльныя іерархіі нярэдка сціраюцца, але культурныя ўстаноўкі абразлівых паводзінаў захоўваюцца. Тут ёсць некалькі ключавых аспектаў:

- Уплыў міграцыйнага стрэсу. Сацыяльная і эканамічная нестабільнасць у эміграцыі стварае ўразлівасць, асабліва для жанчын, што ўзмацняе іх залежнасць ад навакольных і ўскладняе адмову ад непажаданых узаемадзеянняў.
- Адсутнасць дакладных механізмаў абароны. Беларускія супольнасці ў эміграцыі часта самаарганізуюцца і не маюць інстытуцыйных структураў, якія маглі б расследаваць выпадкі харасменту ці абараняць пацярпелых. Гэта прыводзіць да таго, што праблема застаецца нябачнай і не атрымлівае належнай рэакцыі.

## Чаму варта казаць пра гэта заўсёды?

Абмеркаванне харасменту – не пагроза рэвалюцыі, а яе частка. Барацьба за свабоду і правы чалавека ўключае не толькі палітычную незалежнасць, але і стварэнне грамадства, свабоднага ад гвалту, уключна з абаронай жанчын. Калі гэтая праблема будзе замоўчвацца, гэта толькі ўмацуе сістэмы прыгнёту, якія беларускае грамадства імкнецца пераадолець.

Акрамя таго, важна падкрэсліць значнасць прынцыпаў нягвалту, а таксама захавання і абароны правоў усіх групаў насельніцтва для прасоўвання і ўмацавання дэмакратыі як дзяржаўнага ладу.

Харасмент у беларускай грамадзянскай супольнасці ў эміграцыі – гэта не проста прыватны выпадак асобных інцыдэнтаў, а адлюстраванне сістэмных праблемаў культуры, заснаванай на патрыярхальных установах і нармалізацыі гвалту. Толькі адкрытае прызнанне праблемы і ўкараненне механізмаў абароны дапамогуць стварыць умовы, дзе барацьба за свабоду не будзе азмрочаная ігнараваннем правоў чалавека і годнасці жанчын.

# Метадалогія

Збор дадзеных ажыццяўляўся з дапамогай анкетавання ў Google Forms з закрытымі і адкрытымі пытаннямі, што дазволіла атрымаць як колькасныя, так і якасныя дадзеныя. Апытанне праводзілася на працягу двух тыдняў, падчас якіх было сабрана 39 адказаў у форме, а таксама праведзена 8 глыбінных інтэрв'ю. Апытанне было ананімным, што стымулявала шчырыя адказы. Глыбінныя інтэрв'ю праводзіліся ў фармаце анлайн-званкоў на бяспечнай платформе, з дапамогай Signal, Telegram, Google Meet, Zoom, таксама, на аснове ананімнасці і канфідэнцыйнасці. Акрамя гэтага было праведзена 4 інтэрв'ю з эксперткамі ў тэме харасменту, абароны правоў жанчын. Апытанне праводзілася па- беларуску і па-расейску, каб ахапіць як мага больш людзей і розных сфераў. Дадзеныя былі сабраныя, апрацаваныя і прааналізаваныя з выкарыстаннем метадаў статыстычнага і змястоўнага аналізу.

Дадзеная справаздача падрыхтаваная Прававой Ініцыятывай сумесна з Настай Базар[4].

Згодна з Канвенцыяй Міжнароднай арганізацыі працы №190:

(a) Тэрмін «гвалт і дамаганні» ў свеце працы ахоплівае шэраг непрымальных дзеянняў і практык, а таксама пагрозаў іх здзяйснення, незалежна ад таго, адбываюцца яны аднаразова ці неаднаразова, якія накіраваныя на прычыненне або могуць прывесці да фізічнай, псіхалагічнай, сексуальнай ці эканамічнай шкоды. Гэта ўключае гвалт і дамаганні, заснаваныя на гендарнай прыналежнасці.

(b) Тэрмін «гендарна абумоўлены гвалт і дамаганні» азначае гвалт і дамаганні, накіраваныя на людзей з-за іх полу ці гендару, або якія непрапарцыйна закранаюць асобаў пэўнага полу ці гендару. Гэта таксама ўключае сексуалізаваныя дамаганні.[5]

Харасмент распаўсюджваецца на супрацоўнікаў усіх катэгорый, уключаючы стажорак, валанцёрак, тых хто шукае працу, і нават тых, чые працоўныя адносіны ўжо завершаныя. Актуальна для ўсіх сектараў эканомікі (фармальнай і нефармальнай) і ўсіх умоваў працы, уключаючы дыстанцыйныя формы, прафесійныя трэнінгі, а таксама на камунікацыі праз інфармацыйныя тэхналогіі,

[4] Наста Базар – беларуская феміністка і актывістка, якая рэалізавала шэраг значных сацыяльных праектаў. Яна займалася дапамогай беларусам і беларускам, вымушаным бегчы ва Украіну ў 2020 - 2021 гадах, а таксама падтрымкай людзей, якія ратаваліся ад поўнамаштабнай вайны ва Украіне ў 2022 годзе. Наста ініцыявала і ўдзельнічала ў запуску кампаніі Support UA women, накіраванай на збор сродкаў для жанчын, якія пацярпелі ад сексуалізаванага гвалту падчас вайны. А таксама, як згадана вышэй, была арганізатаркай Марша памяці Лізы.

[5] Канвенцыя МАП №190: https://normlex.ilo.org/dyn/normlex/en/f?p=NORMLEXPUB:12100:0::NO::P12100_ILO_CODE:C190

жыллё, якое даецца працадаўцам, і маршруты на працу.6

Варта адзначыць, што рознагалоссі з нагоды выканання працы ці іншых працоўных пытанняў не лічацца харасментам, а разглядаюцца ў кантэксце кіравання эфектыўнасцю.7

Пры гэтым важна адзначыць тэрміналогію, пазначаную ва ўнутранай Палітыцы па прадухіленні харасменту, сексуалізаванага харасменту, дыскрымінацыі і злоўжывання ўладай, прынятай структурным падраздзелам Арганізацыі аб'яднаных нацый – ААН- жанчыны, паколькі яна з'яўляецца больш шырокай.8

У дадзенай справаздачы мы разглядаем сексуалізаваны харасмент як любыя непажаданыя паводзіны сексуальнага характару, якія могуць быць разумна ўспрынятыя ці чакацца як абразлівыя і (ці) зневажальныя для іншага чалавека, калі такія паводзіны замінаюць працы ці ствараюць запалохвальную, варожую ці абразлівую працоўную атмасферу, якія накіраваныя на прычыненне ці могуць прывесці да фізічнай, псіхалагічнай, сексуальнай або эканамічнай шкоды.

Як прыклад, формамі харасменту могуць быць:

- недарэчныя кампліменты знешнасці;
- жарты, паддражніванне ці каментары з сексуальным падтэкстам, якія выклікаюць у пацярпелай пачуццё дыскамфорту ці няёмкасць;
- прапановы заняцца сексам ці агаліцца – за грошы ці проста так, у тым ліку

---

[6] арт. 2-3 Канвенцыі МАП №190.

[7] Бюлетэнь Генеральнага сакратара «Забарона дыскрымінацыі, пераследу, уключаючы сексуальныя дамаганні, і злоўжывання ўладай»: https://documents.un.org/doc/undoc/gen/n08/238/36/pdf/n0823836.pdf

[8] **Харасмент** – гэта любыя неналежныя паводзіны, якія могуць быць разумна ўспрынятыя ці чакацца як абразлівыя ці зневажальныя для іншага чалавека, калі такія паводзіны замінаюць працы ці ствараюць запалохвальную, варожую ці абразлівую працоўную атмасферу. Харасмент можа выяўляцца ў словах, жэстах або дзеяннях, якія раздражняюць, палохаюць, абражаюць, зневажаюць, запалохваюць, прыніжаюць годнасць або ставяць іншага чалавека ў няёмкае становішча. Харасмент можа быць накіраваны на аднаго або некалькіх чалавек, зыходзячы з агульнай характарыстыкі або прыкметы, як пазначана ў вызначэнні дыскрымінацыі вышэй. Звычайна харасмент мае на ўвазе серыю інцыдэнтаў. **Сексуалізаваны харасмент** – гэта любыя непажаданыя паводзіны сексуальнага характару, якія прыводзяць да фізічнай, псіхалагічнай ці сексуальнай шкоды і могуць быць разумна ўспрынятыя ці чакацца як абразлівыя або зневажальныя, калі такія паводзіны замінаюць працы, становяцца ўмовай працаўладкавання ці ствараюць запалохвальнае, варожае ці абразлівае працоўнае асяроддзе. Сексуалізаваны харасмент можа адбывацца на працоўным месцы або быць звязаным з працай. Хоць ён звычайна мае паводзіны, якія паўтараюцца, сексуалізаваны харасмент можа быць прадстаўлены ў форме адзінага інцыдэнту. Пры ацэнцы разумнасці чаканняў ці ўспрыманняў улічваецца пункт гледжання чалавека, які стаў мішэнню такіх паводзінаў. Сексуалізаваны харасмент з'яўляецца праявай культуры дыскрымінацыі і прывілеяў, заснаваных на няроўных гендарных адносінах і іншых дынаміках улады. Ён можа ўключаць любыя вербальныя, невербальныя або фізічныя паводзіны, уключаючы пісьмовыя і электронныя камунікацыі. Сексуалізаваны харасмент можа адбывацца паміж людзьмі аднаго або рознага полу, і асобы любога полу могуць быць як пацярпелымі, так і меркаванымі вінаватымі. Сексуалізаваны харасмент можа адбывацца за межамі працоўнага месца і па-за працоўным часам, уключаючы афіцыйныя паездкі ці сацыяльныя мерапрыемствы, звязаныя з працай. Ён можа быць здзейснены любым калегам, уключаючы кіраўніка, роўнага па пасадзе або падпарадкаванага. Статус вінаватага як кіраўніка або старэйшай службовай асобы можа разглядацца як абцяжарвальныя абставіны. – https://www.unwomen.org/sites/default/files/Headquarters/Attachments/Sections/About%20Us/Accountability/UN-Women-Harassment-sexual-harassment- discrimination-and-abuse-of-authority-policy-en.pdf

выказаныя ў нібыта жартаўлівым тоне;

- няўзгодненыя тактыльныя кантакты: пачапаць шыю (напр. масаж), талію, плясканне па ягадзіцах, якія таксама могуць «прыкрывацца» выпадковымі дотыкамі і іншыя падобныя дзеянні;
- пагрозы ( не заўжды пераходзяць у дзеянне ) нанесці пацярпелай шкоду (уключаючы пагрозы пазбаўлення прэмій, звальненне, распаўсюджванне асабістых дадзеных), калі яна не пагодзіцца на сексуальныя адносіны.

Прыклады невербальнага харасменту ўключаюць:

- Размяшчэнне абразлівых матэрыялаў, уключаючы плакаты, фотаздымкі, карыкатуры, графіці, прадметы ці паведамленні на дошках аб'яваў, сталах або ў агульных зонах з сексуальным падтэкстам;
- Паўторнае дарэнне непажаданых падарункаў ці запрашэнняў;
- Пастаянны пільны погляд;
- Наўмыснае ўсталяванне ці дасыланне непрыстойных карцінак / фотаздымкаў, здольных абразіць іншых і нанесці шкоду (напрыклад, агаленыя часткі цела, дыпфэйкі[9]);
- Выкарыстанне электроннай пошты, месэнджараў ці сацыяльных сетак для адпраўкі сексуалізаваных выяваў іншаму супрацоўніку ці супрацоўнікам.

У справаздачы мы вызначаем **сферу праявы харасменту**, дзе ёсць працоўныя і звязаныя з імі адносіны, незалежна ад таго, працаўладкаванне з'яўляецца афіцыйным ці не, гэта працоўная дамова ці дамова падраду, супрацоўніцтва як на роўных, так і валанцёрства, а таксама, сферы, дзе адзін з бакоў на працоўным месцы, дзе загадзя прысутнічае іерархія і ўразлівасць (напрыклад, гінекалогія, псіхалогія / псіхатэрапія, атрыманне бязвыплатнай дапамогі і да т.п.).

**Актарамі харасменту** могуць быць як непасрэдныя кіраўнікі, так і падначаленыя, калегі, ментары / менці, валанцёры, людзі, якія надаюць дапамогу, паслугі і інш.

---

[9] Deepfake – дыпфэйкі выкарыстоўваюць форму штучнага інтэлекту, названую глыбокім навучаннем, для стварэння выяваў фэйкавых падзеяў, адсюль і назва дыпфэйк; Кампанія Deeptrace, якая займаецца распрацоўкай штучнага інтэлекту, выявіла ў сетцы 15 000 відэа з дыпфэйкамі ў верасні 2019 года. Ашаламляльныя 96% з іх былі парнаграфічнымі , і 99% з іх адлюстроўвалі асобы знакамітасцяў на тварах порназорак. Паколькі новыя метады дазваляюць некваліфікаваным людзям рабіць дыпфэйкі з дапамогай некалькіх фотаздымкаў, падробленыя відэа, хутчэй за ўсё, выйдуць за межы свету знакамітасцяў і стануць крыніцай парнаграфічнай помсты. Як кажа Даніэль Сітрон, прафесар права ў Бостанскім універсітэце: «Тэхналогія дыпфэйкаў выкарыстоўваецца ў якасці зброі супраць жанчын». Акрамя порна, ёсць шмат пародый, сатыры і гарэзлівасці. https://www.theguardian.com/technology/2020/jan/13/what-are-deepfakes-and-how-can-you-spot-them

# Аналіз адказаў анлайн-формы

### Мова рэспандэнтак

28% рэспандэнтак прайшлі апытанне па-расейску і 72% – па-беларуску.

### Узрост рэспандэнтак

Больш за палову рэспандэнтак былі ва ўзросце 25-34 гадоў (53,6%). Даволі вялікая группа – 18-24 гадоў (29,2%). Ва ўзросце 35-44 і 45-55 колькасць рэспандэнтак склала 7,3% Старэйшымі за 56 гадоў былі 2,4% апытаных жанчын.

### Геаграфія рэспандэнтак

61,5% рэспандэнтак на момант збору дадзеных жылі ў Польшчы, 15,4% – у Літве, 10,3% – у Грузіі, 5,1% – у Германіі, 2,6% у ЗША, Нідэрландах.

### Сфера дзейнасці




25,6% рэспандэнтак не адзначылі сферу адукацыі, 28,2% – НКА (некамерцыйныя арганізацыі, у тым ліку праваабарончы сектар), 17,9% – IT, 10,3% – журналістыка, 5,1% – беларускі бізнес за мяжой, 5,1% – сфера культуры, 7,7% – іншае (рэспандэнткі адзначалі такія сферы як палітыка, тэлебачанне, гастранамія, індустрыя прыгажосці).

## « Ці сутыкаліся вы з харасментам у вашым прафесійным асяроддзі: дыскрымінацыяй, маральным ціскам (булінгам), дзеяннямі сексуалізаванага характару?»

43,9% рэспандэнтак заявілі, што не сутыкаліся, і 56,1% паведамілі пра падобны досвед. *Адказваючы на ўдакладняльныя пытанні, высветлілася, што 79% усіх рэспандэнтак хаця б раз у жыцці зведвалі той ці іншы від харасменту*. Гэта сведчыць пра тое, што жанчыны не заўсёды асацыююць дзеянні, якія здзяйсняюцца ў дачыненні да іх, як харасмент.

## «Ці сутыкаліся вы з сексуалізаваным дамаганнем?»




Такім чынам, найбольш распаўсюджанымі формамі сексуалізаваных дамаганняў аказаліся сексуалізаваныя каментары і фізічны кантакт без згоды. То бок, слоўныя і фізічныя дамаганні з'яўляюцца найбольш частымі і адчувальнымі формамі парушэння асабістых межаў у працоўным асяроддзі.

Дакучлівая ўвага (17,3%) таксама займае значнае месца, што сведчыць пра сістэматычнае парушэнне прафесійных межаў праз пытанні асабістага характару і празмерную ўвагу. Гэта стварае дадатковы ціск на жанчын і можа прыводзіць да пачуцця неабароненасці і дыскамфорту.

Пры гэтым прапанова ўступіць у інтымную сувязь наўзамен на кар'ерныя магчымасці зусім не згадвалася, што можа казаць або пра недастатковую гатоўнасць рэспандэнтак раскрываць такія выпадкі, або пра іх адсутнасць у названых сферах. Важна адзначыць, што такія праявы сексуалізаваных паводзінаў не толькі падрываюць прафесіяналізм і давер у камандзе, але і могуць істотна ўплываць на псіхаэмацыйны стан жанчын, пагаршаючы іх маральны стан і кар'ерныя перспектывы.

## Канкрэтныя сітуацыі, з якімі рэспандэнткі сутыкнуліся ці пра якія ім вядома

Непрымальныя паводзіны на працы:

- кіраўнік ударыў рэспандэнтку па ягадзіцах, калі яна папрасіла яго праверыць працоўны працэс. Пасля таго як яна выказала сваё абурэнне, ён заявіў, што нічога не адбылося.
- Рэспандэнтка апісала свой досвед працы, якую яна пакінула з-за адсутнасці афіцыйнага працаўладкавання. Паводле яе словаў, наймальнік дапускаў некарэктныя паводзіны, знаходзячыся ў стане алкагольнага ап'янення на працоўным месцы, уключаючы прыніжэнне калег і спробы праявы непажаданых знакаў увагі.

Сітуацыі, апісаныя рэспандэнткамі, падкрэсліваюць розныя аспекты харасменту, уключаючы як сексуалізаваны гвалт, так і непажаданыя дотыкі і псіхалагічны ціск. Важна адзначыць, што ў некаторых выпадках рэспандэнткі сутыкаюцца з праблемай недаацэнкі сваіх перажыванняў з боку навакольных, асабліва ў кантэксце працы, дзе некаторыя выпадкі (напрыклад, на працоўным месцы) могуць успрымацца як нармалізаваныя паводзіны, што спрыяе ўзнікненню пачуцця беспакаранасці ў актара харасменту.

Таксама значная ўвага нададзеная сітуацыям у эміграцыі, што падкрэслівае важнасць падтрымкі і абароны жанчын у замежных краінах, дзе прававая і сацыяльная структура можа значна адрозніваецца ад звыклай. Згаданыя прыклады гвалту і ціску таксама пацвярджаюць неабходнасць наяўнасці механізмаў абароны на ўсіх узроўнях – ад сямейных адносінаў да прафесійных узаемадзеянняў.

## «Хто быў актарам харасменту?»

65% рэспандэнтак змаглі пазначыць актара харасменту. З гэтага ліку, 69% пазначылі актара харасменту – кіраўніка, 31% – калегу па працы.

## «Ці казалі вы каму-небудзь пра выпадкі харасменту?»

Адказы рэспандэнтак размеркаваліся наступным чынам:




Гэтыя дадзеныя паказваюць, што толькі крыху менш за палову пацярпелых (44%) знаходзілі ў сабе смеласць або магчымасць падзяліцца тым, што здарылася. Астатнія адказы дэманструюць значны ўзровень недаверу да сістэмы рэагавання, нармалізацыю з боку грамадства праяваў харасменту, страху перад наступствамі, а таксама недахоп дасведчанасці пра наяўныя механізмы дапамогі і падтрымкі.

Пры гэтым, 17% рэспандэнтак, якія пацярпелі ад харасменту, распавялі пра тое, што здарылася, блізкім.

## «Якой была рэакцыя кіраўніцтва, калі вы паведамлялі пра выпадак харасменту?»

Адказы размеркаваліся наступным чынам:




Гэтыя вынікі сведчаць пра тое, што ў большасці выпадкаў рэакцыя кіраўніцтва была або неэфектыўнай, або адсутнічала зусім. Толькі 17% рэспандэнтак

адзначылі, што меры сапраўды былі прынятыя. Аднак у 33% выпадкаў, нягледзячы на зробленыя дзеянні, сітуацыя засталася без зменаў. Гэта падкрэслівае неабходнасць больш сур'ёзнага падыходу да такіх скаргаў, павышэння адказнасці кіраўніцтва і стварэння больш эфектыўных механізмаў рэагавання.

## «Ці вядомыя вам сітуацыі харасменту сярод вашых знаёмых?»

Пытанне было зададзенае, каб вызначыць аб'ём праблемы, а таксама зразумець узровень яе распаўсюджанасці.

Рэспандэнткі падзяліліся наступнымі прыкладамі:

*Сексуалізаваны гвалт і ціск на працы*

- 5 рэспандэнтак сказалі пра пагрозы звальнення, прапановы сустрэцца па-за працоўным месцам (напрыклад, прыехаць дадому ці схадзіць у кіно), а таксама пра негатыўныя змены ў дачыненні да іх пасля адмовы, што ў асобных выпадках прыводзіла да звальнення праз некалькі месяцаў.

*Непажаданая ўвага*

- 1 з рэспандэнтак прывяла прыклад, калі мужчына настойліва запрашаў яе сяброўку на прыватную вячэру, нягледзячы на яе адмову.

*Сексуалізаваны гвалт і сталкінг*

- 2 рэспандэнткі адзначылі выпадкі сексуалізаванага гвалту і сталкінгу ў сферы беларускага актывізму.

*Сексуалізаваныя каментары*

- Многім рэспандэнткам вядомыя сітуацыі, калі выкладчыкі навучальных установаў рабілі недапушчальныя заўвагі датычна знешнасці ці адзення дзяўчатаў.

*Алкаголь і маніпуляцыі*

- 1 рэспандэнтка падзялілася вядомым ёй выпадкам, калі калега неаднаразова напойваў каляжанак, каб пасля ўступіць з імі ў сексуалізаваны кантакт.

*Парушэнне асабістых межаў*

- 1 рэспандэнтка паведаміла пра выпадак, калі выкладчык у акадэміі без згоды цалаваў яе сяброўку падчас заняткаў.

У дадзеных прыкладах выразна вылучаюцца тры ключавыя праблемы.

**Першая:** злоўжыванне ўладай і парушэнне субардынацыі. Многія з апісаных выпадкаў звязаныя з тым, што актары харасменту выкарыстоўваюць сваё прафесійнае становішча для ціску.

**Другая:** маніпуляцыі праз уразлівасць пацярпелай. Гэта тычыцца як выкарыстання алкаголю, так і шантажу звальненнем.

**Трэцяя:** адсутнасць механізмаў абароны. Многія са згаданых сітуацый маглі быць спыненыя, калі б існавалі дзейсныя інструменты прадухілення і пакарання падобных дзеянняў.

Гэтыя прыклады падкрэсліваюць неабходнасць комплексных рашэнняў, уключаючы ўкараненне дакладных этычных стандартаў у адукацыйных і прафесійных установах, працу з культурай паводзінаў і ўсведамленне адказнасці за падобныя дзеянні.

## Успрыманне харасменту ў беларускай супольнасці ў эміграцыі: «Як вы лічыце, ці з'яўляецца харасмент распаўсюджанай з'явай у беларускім грамадстве ў эміграцыі?»

Размеркаванне адказаў:



Большасць рэспандэнтак (72,5%), уключаючы тых, хто абраў адказы «Так, гэта сур'ёзная праблема» і «Хутчэй так», лічаць, што харасмент з'яўляецца распаўсюджанай з'явай у беларускім грамадстве ў эміграцыі. Гэта сведчыць пра высокую дасведчанасць пра праблему і яе наступствы.

Аднак частка рэспандэнтак (22,5%) схіляецца да меркавання, што харасмент, хутчэй, не з'яўляецца масавай праблемай, а 5% зусім не лічаць яго значнай. На наш погляд, магчымымі прычынамі могуць быць:

- Адрозненні ў асабістым вопыце і ўмовах пражывання;
- Недастатковая інфармаванасць або жаданне не прызнаваць праблему.

## Аналіз глыбінных інтэрв'ю

Рэспандэнткі адзначаюць, што ад працы ў сферах з выяўленай сацыяльнай місіяй (медыя, НДА, сацыяльная праца і інш.) яны чакаюць бяспечнага асяроддзя і агульных каштоўнасцяў. Таму сутыкаючыся з харасментам, яшчэ складаней усвядоміць тое, што адбываецца, і заявіць пра гэта. Напрыклад, адна з удзельніц сказала:

*«Мы змагаліся за рэвалюцыю, таму людзі баяцца расчаравацца і абараняюць тое, што адбываецца».*

Гэты каментар падкрэслівае канфлікт паміж чаканнямі і рэальнасцю: нават у асяроддзі, арыентаваным на прагрэсіўныя змены, дамінуе страх прызнання праблемаў, што ўзмацняе траўматычнасць перажыванняў. Больш за тое, часта праявы харасменту ўспрымаюцца як нешта звычайнае і «несур'ёзнае».

У той жа час ад сферы палітыкі чаканні адваротныя: прадузятасць у дачыненні да жанчын выяўленая больш адкрыта. Напрыклад, гучалі такія выказванні:

*«Як толькі жанчына атрымлівае пасаду, значыць, у яе былі стасункі з кімсьці з галоўных мужчын».*

Гэтыя словы ілюструюць стэрэатыпы, якія абясцэньваюць прафесійныя дасягненні жанчын.

## Гендарныя дысбалансы

- Жанчыны выконваюць чарнавую працу, а мужчыны займаюць кіруючыя пазіцыі. Прыклад з інтэрв'ю:

*«У нас велізарная колькасць жанчын робяць чарнавую працу, а кіраўнічы склад– пераважна мужчынскі».*

Гэта сведчыць пра сістэмную гендарную сегрэгацыю працы, дзе жанчыны застаюцца ў нябачных, менш прэстыжных ролях, што абмяжоўвае іх магчымасці росту, пакідаючы жанчын ва ўразлівым становішчы.

- Верагоднасць харасменту вышэй у калектыве з мужчынскім кіраўніцтвам. Адна з рэспандэнтак адзначыла:

*«Я ведаю як мінімум дзвюх супрацоўніц, якія былі спакушаныя на працоўным месцы. Пакуль яна яго "каханка", яна атрымлівае бонусы, а потым пачынаюцца арэлі – пагрозы, абясцэньванне, уразанне зарплаты».*

Гэты прыклад дэманструе, як адсутнасць дакладных межаў і адказнасці ў кіраўніцтва стварае прастору для злоўжыванняў. Залежнасць ад «бонусаў» узмацняе траўматычнасць сітуацыі і пачуццё бездапаможнасці.

## Асноўныя праявы харасменту

Самыя распаўсюджаныя формы паводле словаў рэспандэнтак:

1. Кампліменты з сексуальным падтэкстам.

*«"О, як добра выглядаеш!" [кіраўнік], – сексуалізавана жартаваў. Яна мерала сукенку, і ён сказаў: "А мне паказаць?"».*

Гэтая цытата ілюструе паўсядзённы харасмент, які нармалізуецца ў працоўным асяроддзі. Нават такія, на першы погляд, кампліментарныя каментары ў дачыненні да жанчын ствараюць дыскамфорт і парушаюць асабістыя межы.

2. Фізічныя дотыкі:

*«Мне было 19 гадоў, да мяне падыходзіць дарослы мужчына і пачынае рабіць масаж плячэй. А вакол шмат людзей. У мяне рэакцыя замірання, і я гляджу – ніхто не кажа, што гэта не ок. Толькі калі ён паспрабаваў зрабіць тое ж самае з іншай дзяўчынай, а яна адмовіла, я зразумела, што можна сказаць "не"».*

Гэты выпадак падкрэслівае як нармалізацыю непрыстойных паводзінаў, так і неабходнасць падтрымкі жанчын з боку калектыву, каб забяспечыць недапушчальнасць падобных дзеянняў. Маўчанне навакольных узмацняе пачуццё бездапаможнасці, асабліва ў маладых жанчын.

# Улада і ўразлівасць

Жанчыны часта баяцца казаць пра харасмент з-за канцэнтрацыі ўлады ў руках аднаго чалавека. Манаполія ўлады на працоўным месцы ўзмацняе страх і душыць супраціў. Жанчыны адчуваюць, што любая скарга можа паставіць пад пагрозу іх кар'еру ці існаванне праекта.

Так адна рэспандэнтка заявіла:

*«Прыняцце рашэння завязанае на адным чалавеку. Таму жанчыны практычна не гавораць – у гэтай сферы працу потым проста не знайсці».*

*«У нас часта завабліваюць бонусамі, а потым пачынаецца жорсткі аб'юз: "Куды ты дзенешся?"»*

Такая структура ўзмацняе пачуццё безабароннасці. Адна з рэспандэнтак сказала:

*«Я разумею, што калі пачну гаварыць, са мной спыняць супрацоўніцтва, а свет дзеліцца на лагеры "за" і "супраць". Гэта добраахвотная ізаляцыя».*

Гэты аналіз адлюстроўвае тое, як траўматычнасць харасменту ўзмацняецца ізаляцыяй пацярпелых, што пазбаўляе іх падтрымкі і прымушае маўчаць.

# Эміграцыя як абцяжарвальны фактар

Ва ўмовах эміграцыі ў жанчын узмацняецца пачуццё ўразлівасці. Многія з іх сутыкаюцца з адчуваннем беспакаранасці ў актараў харасменту.

*«У эміграцыі многія актары харасменту адчуваюць, што ім нічога не будзе».*

*«Фінансавы момант вельмі важны. Я не магла знайсці працу, таму працягвала цярпець».*

Тут варта зрабіць акцэнт на слабасці інстытуцыйных механізмаў, асабліва ва ўмовах эміграцыі. Адсутнасць прававой абароны і размытыя межы адказнасці фармуюць у жанчын пачуццё безвыходнасці.[10] Таксама ўзмацняецца адчуванне ўразлівасці, што прыводзіць да фармавання ланцужка асцярог: выказванне незадаволенасці – звальненне – немагчымасць знайсці працу ў пэўнай сферы.

---

[10] Гвалт нясе за сабой сур'ёзныя кароткатэрміновыя і доўгатэрміновыя фізічныя, эканамічныя і псіхалагічныя наступствы для жанчын і дзяўчатак, перашкаджаючы іх поўнаму і раўнапраўнаму ўдзелу ў жыцці грамадства: https:// eca.unwomen.org/ru/stories/explainer/2023/11/chasto-zadavaemye-voprosy-vidy-nasiliya-v-otnoshenii-zhenschin-i-devochek

Усё гэта пагаршаецца фінансавай нестабільнасцю, што падвышае рызыку эксплуатацыі жанчын ва ўразлівым становішчы.

## Сацыяльная рэакцыя і бяссілле

Рэспандэнткі адзначаюць адсутнасць падтрымкі з боку грамадства і складанасці ў змене сацыяльных нормаў.

*«Я чытаю жаночыя паблікі. Жанчыны часта вінавацяць іншых: "Чаго ты цярпіш?". Ты разумееш, што падтрымкі не знойдзеш, толькі "гаўно на галаву"».*

Дадзенае выказванне ілюструе, як грамадская рэакцыя можа ссоўваць фокус з актара гвалту на пацярпелую. Аналагічная сітуацыя назіраецца і ў кантэксце хатняга гвалту, дзе абвінавачанні часта накіраваныя ў адрас пацярпелай: «Ты сама вінаватая!», «Навошта ты гэта церпіш?». Такія заўвагі з боку іншых людзей узмацняюць пачуццё віны і перашкаджаюць адкрытым выказванням пра праблему, робячы яе яшчэ больш нябачнай, а жанчын – яшчэ больш уразлівымі.11

Яшчэ адзін прыклад:

*«Дзяўчына, якая пазнаёміла мяне з гэтым чалавекам, аднойчы сказала: "Ён вельмі напаіў мяне. Я заснула, а прачнулася пераапранутая. Ён сказаў, што я абванітавалася, і ён мяне пераапрануў. Але цяпер [пасля таго, як рэспандэнтка падзялілася з ёй сваёй гісторыяй харасменту] у мяне няма гарантыі, што нічога не было"».*

Гэтая сітуацыя пацвярджае тэзіс пра неабходнасць змены грамадскай рыторыкі, змяшчэння фокусу з абвінавачвання пацярпелых, недаверу, газлайтынгу, на недапушчальнасць харасменту агулам, а таксама на актара харасменту. У адваротным выпадку, жанчыны застаюцца сам-насам з сумневамі, ці былі іх адчуванні абгрунтаваныя, і пачуццём бездапаможнасці.

---

[11] Гаворка ідзе пра Віктымблэймінг: «Віктымблэймінг» (абвінавачанне пацярпелай) прысутнічае ў той ці іншай ступені пры ўсіх формах гвалту. Калі мы чуем пра гвалтоўны інцыдэнт, нам уласціва аналізаваць паводзіны пацярпелай, каб пераканаць сябе, што, пазбягаючы пэўных рызык або дзеянняў (напрыклад, позніх прагулак у адзіноце, наведвання «небяспечных» раёнаў, пакідання дзвярэй незачыненымі або «правакацыйнага» адзення), мы зможам пазбегнуць гвалту. Гэта натуральны акт псіхалагічнай самаабароны, аднак ён факусуе нашую ўвагу на меркаванай адказнасці ахвяры і можа адцягнуць нас ад поўнага аналізу дзеянняў злачынца. У выпадку гендарнага гвалту падобнае змяшчэнне адказнасці да пацярпелай засяроджвае ўвагу на яе паводзінах, а не на структурных прычынах і няроўнасці, якія ляжаць у аснове гвалту, здзейсненага супраць яе. – https://www.unescwa.org/sd-glossary/victim-blaming

# Прычыны маўчання жанчын

Асноўныя прычыны:

- Харасмент успрымаўся нормай як у Беларусі, так і застаецца такім у супольнасцях ва ўмовах эміграцыі.

*«У Беларусі плясканне па попе і хапанне падначаленых было нормай».*

Тут варта адзначыць, што гістарычная цярпімасць да харасменту фармуе культуру маўчання, дзе парушэнне асабістых межаў становіцца штодзённасцю.

- Страх рэпутацыйных наступстваў.

*«Сістэма працуе так: чалавек, які робіць гадасці, працягвае працаваць. Ён усё яшчэ выглядае ўсёмагутным, яму давяраюць. Ты баішся, што з-за рэпутацыі працу не знойдзеш».*

Гэты каментар падкрэслівае залежнасць ад харызматычных лідараў, якая ўмацоўвае страх сацыяльных і прафесійных санкцыяў у дачыненні да пацярпелых ад харасменту.

# Рэкамендацыі па змене сітуацыі ад рэспандэнтак

**1. Павышэнне дасведчанасці і праца над асабістымі межамі.**

- Арганізацыя навучання для жанчын, накіраванага на развіццё навыкаў актыўнага адстойвання сваіх межаў і іх усведамлення, мае ключавое значэнне.

Напрыклад, можна арганізаваць спецыялізаваныя трэнінгі, якія дапамагаюць сфармаваць разуменне таго, што каштоўнасць асобы не залежыць ад прафесійнай дзейнасці («Ты – не твая праца»). Бо шмат якія жанчыны самі не ўсведамляюць калі і як парушаюцца іх межы, у той час як агрэсары схільныя сістэматычна выяўляць уразлівых людзей, якіх можна эксплуатаваць.

Арганізацыі нярэдка прыцягваюць жанчын высакароднымі каштоўнасцямі і ідэямі, а таксама абяцаннямі ўдзелу ў значных праектах. Аднак нярэдкія выпадкі, калі іх праца аказваецца нізкааплатнай або ацэньваецца ў выглядзе надання мінімальных матэрыяльных даброт і прывілеяў, такіх як харчаванне, або магчымасці быць часткай пэўнай супольнасці.

**2. Увядзенне структурных зменаў**

- Сістэма рэпутацыі і юрыдычнай адказнасці.

Важна ўнесці змены ў інстытут рэпутацыі, каб ён сапраўды функцыянаваў. Асобы, якія зрабілі дзеянні, што можна расцэньваць як харасмент, павінны пазбаўляцца прафесійнай рэпутацыі, што выключае далейшы доступ да грантаў. Так, напрыклад, у ААН ёсць сервіс, які фіксуе асобаў, якія здзяйсняюць харасмент, вядзе агульную базу для недапушчэння займання пасады ў структурах ААН яшчэ раз[12].

- Юрыдычная дапамога.

Неабходна ўвесці бясплатную і незалежную адвакацкую дапамогу для пацярпелых. Гэта забяспечыць абарону правоў жанчын і магчымасць звярнуцца па падтрымку ў складаных сітуацыях.

**3. Дакументаванне і фіксаванне парушэнняў**

Неабходна сфармаваць базу дадзеных пра выпадкі харасменту, каб забяспечыць дакументальныя пацвярджэнні і захаваць факты.

**4. Навучанне жанчын**

- Прававая адукаванасць і ўпэўненасць.

Даць жанчынам адукацыйныя магчымасці для развіцця дасведчанасці пра свае правы, спосабы іх абароны і метады супрацьдзеяння неправамерным дзеянням. Навучанне павінна ўключаць навыкі распазнавання патэнцыйна ўразлівых сітуацыяў, уменне ўсталёўваць і адстойваць асабістыя межы, а таксама веды пра даступныя юрыдычныя і сацыяльныя механізмы абароны. Такая падрыхтоўка дапаможа не толькі пазбегнуць рызыкі эксплуатацыі, але і сфармаваць упэўненасць ва ўласнай здольнасці спраўляцца з цяжкасцямі і адстойваць свае інтарэсы.

> *«Жанчыны павінны разумець свае правы, быць упэўненымі ў сабе і не баяцца дзейнічаць, калі іх межы парушаныя».*

- Змена парадыгмы.

Сістэма, сфармаваная ва ўмовах патрыярхальных установак, мяркуе, што мужчыны павінны несці адказнасць за фінансавае забеспячэнне сям'і, у той час як праца жанчын абясцэньваецца. Нягледзячы на тое, што жанчыны ў такой сістэме бяруць на сябе значную частку абавязкаў як у бытавой, так і ў прафесійнай сферах, іх унёсак часта застаецца нябачным.

---

[12] https://shknowledgehub.unwomen.org/en

*«Гэта парадыгма, дзе жанчына, нягледзячы на сваю адказнасць, працягвае выконваць абясцэненую працу».*

**5. Стварэнне сістэмы абароны супрацоўніц**

- Фармаванне незалежнага прафсаюза.

Прафсаюз абавязаны забяспечваць абарону правоў супрацоўніц без кругавой парукі. Гэта асабліва важна для забеспячэння:

  - аплаты бальнічных лістоў;
  - гарантыі адпачынкаў;
  - абароны ад звальненняў без папярэджання.

Прыклад:

*«Адну з супрацоўніц звольнілі за два тыдні да канца месяца без папярэджання, проста паставіўшы перад фактам. У яе не было часу знайсці новую працу ці падрыхтавацца».*

**6. Салідарнасць і калектыўныя дзеянні**

- Аб'яднанне жанчын для выпрацоўкі сумесных рашэнняў у супрацьдзеянне праяваў харасменту.

*«Не маўчаць – аб'ядноўвацца. Сабраліся, вырашылі».*

Калектыўныя дзеянні і кансалідацыя жанчын могуць стаць эфектыўным механізмам для змены грамадскага ўспрымання праблемы.

- Праца па змене поглядаў.

Многія мужчыны, нават не маючы прамых намераў парушыць межы, могуць не ўсведамляць, што іх паводзіны непрымальныя. У сувязі з гэтым вельмі важна весці з імі канструктыўны дыялог для павышэння дасведчанасці пра праблему харасменту.

*«Я думаю, што многія мужчыны, якія не мелі нічога дрэннага на ўвазе, пачнуць разумець праблему, калі ім пра гэта растлумачыць».*

# Аналіз харасменту: прычыны, узаемасувязь з сацыяльнымі структурамі, праз меркаванні экспертак са сферы абароны правоў жанчын

Для дадзенай справаздачы былі прыцягнутыя 4 незалежныя эксперткі, якія займаюцца тэмай абароны правоў жанчын, прасоўваннем жаночых правоў. Экспертнае меркаванне ў дадзенай тэматыцы вельмі важнае для разумення каранёў праблемы, а таксама для пошуку шляхоў рашэння. У выніку, былі зробленыя пэўныя высновы, якія разбітыя па тэматычных блоках.

Харасмент не з'яўляецца ізаляванай ці выпадковай з'явай, а ўяўляе сабой сістэмную праблему, якая з'яўляецца часткай больш шырокай структуры гвалту і дыскрымінацыі13. Гэтыя з'явы ўбудаваныя ў сацыяльныя і культурныя механізмы, якія спрыяюць іх узнаўленню і замацаванню. Структурныя прычыны харасменту звязаныя з эканамічнай і сацыяльнай няроўнасцю, стэрэатыпамі пра ролі мужчын і жанчын, а таксама з нармалізацыяй гвалту.14

*Чаму важна гаварыць пра харасмент?*

Адным з ключавых крокаў у барацьбе з харасментам з'яўляецца адкрытае абмеркаванне праблемы. Калі яна становіцца прадметам публічных размоваў, жанчыны пачынаюць распазнаваць у чужых гісторыях свае ўласныя перажыванні, усведамляючы, што тое, што адбывалася з імі, не было «фліртам», а з'яўлялася формай эксплуатацыі, знявагі і гвалту.

Гэтае ўсведамленне адбываецца праз шматгалоссе і абмен досведам сярод людзей з рознымі гісторыямі.

Неабходна, каб пра гэта гаварыла як мага больш людзей – пацярпелыя, юрысты/кі, псіхалагі/ні, адвакаты/кі, бацькі пацярпелых, дзеці, прадстаўнікі/ніцы ўлады, журналісты/ кі. Толькі калі праблема будзе агучаная з розных бакоў, жанчыны змогуць усвядоміць: гэта было не нормай, не выпадковасцю, а праявамі харасменту, які мае структурныя прычыны.15 Напрыклад, звыклыя «жарты» ці навязлівыя «кампліменты», як «наблізіцца і

---

[13] Ад сексуальных замахаў не абароненая ні адна жанчына – нават калі яна займае высокае становішча ў грамадстве. Па дадзеных Міжпарламенцкага саюза, 82% апытаных жанчын з ліку дэпутатаў зведалі псіхалагічны гвалт у той ці іншай форме, а 20% – сексуальныя дамаганні. Улічваючы маштабы праблемы, у Міжпарламенцкім саюзе выпусцілі рэкамендацыі пра тое, як супрацьстаяць сексізму і харасменту.

https://news.un.org/ru/story/2019/11/1368071

Міжпарламенцкі саюз – гэта сусветная арганізацыя нацыянальных парламентаў. https://www.ipu.org/

[14] https://www.ilo.org/publications/major-publications/preventing-and-addressing-violence-and-harassment-world-work-through

[15] https://www.ywcanwil.org/why-is-it-important-to-talk-about-domestic-violence/

панюхаць парфуму за вушкам», могуць здавацца бяскрыўднымі датуль, пакуль грамадства не пачне абмяркоўваць, што гэта з'яўляецца формай харасменту. Маўчанне і адсутнасць усведамлення таго, што адбываецца, ствараюць атмасферу, у якой пацярпелыя лічаць сябе адзінымі, хто сутыкаўся з такой праблемай:

*«Калі гэта здарылася, значыць, нешта не так са мной». Распавядаць пра гэта важна, каб разбурыць міф пра ўнікальнасць падобных сітуацыяў і паказаць, што гэтая праблема носіць масавы і сістэмны характар.*

## Карані праблемы

Усе віды гвалту ўзаемазвязаныя,16 і ў кантэксце, дзе гвалт уразлівых сацыяльных групаў з'яўляецца нормай, яны становяцца часткай звыклай практыкі ўзаемадзеяння, якая ўключае: акушэрскі гвалт, гвалтоўныя педагагічныя практыкі («ставіць у кут») фізічны і эмацыйны гвалт. Таксама шырока распаўсюджаныя выпадкі праявы цэнтралізаванага гвалту, якія не ўспрымаецца як такі, у прыватнасці ў сферы працы. Калі кіраўнік паводзіць сябе непрыстойным чынам у дачыненні да падначаленых, напрыклад, павышае голас, ён не ўсведамляе гэта як гвалт, і падначаленыя, як правіла, таксама не ўспрымаюць яго паводзіны ў гэтым кантэксце.

Харасмент цесна звязаны з дыскрымінацыяй і гендарнай няроўнасцю.17 Адной з праяваў можна назваць няроўную аплату працы. Заработная плата жанчын на тых жа пасадах меншая, чым у мужчын,18 што фармуе ў грамадстве адчуванне іх «другараднасці». У карпаратыўнай культуры гэта можа выяўляцца ў сітуацыях, дзе да жанчын ставяцца несур'ёзна, ігнаруюць іх прафесіяналізм19.

Гендарная няроўнасць у эканамічнай сферы ў тым ліку стварае перадумовы для харасменту. Важна разумець, што эканамічная залежнасць і дыскрымінацыя ў сферы працы ўзмацняюць уразлівасць жанчын перад дамаганнямі.

Несяброўская абстаноўка на працы. Харасмент часта становіцца часткай стварэння таксічнага працоўнага асяроддзя, дзе жанчын, асабліва маладых, могуць прымушаць трываць знявагу, каб «заслужыць месца ў калектыве».

Дыскрымінацыя сама па сабе стварае глебу для харасменту, бо яна ўзмацняе іерархічныя адносіны і прымушае жанчын успрымаць нягодныя паводзіны як нешта непазбежнае.

---

[16] У дадзеным даследаванні ад 2019 года паказана на графіках, як усе віды гвалту ўзаемазвязаныя: https://socio.bas-net.by/ wp-content/uploads/2022/04/Rezultaty-issledovaniya-o-rasprostranennosti-nasiliya-v-otnoshenii-zhenshhin.pdf

[17] https://eige.europa.eu/publications-resources/toolkits-guides/sexism-at-work-handbook/part-1-understand/what-sexual- harassment?language_content_entity=en

[18] https://eca.unwomen.org/ru/news/stories/2020/9/explainer-everything-you-need-to-know-about-equal-pay

[19] https://www.forbes.com/sites/michelleking/2021/10/26/the-authority-gap-why-women-are-still-taken-less-seriously-than-men/

Варта адзначыць, што ў гвалце прысутнічае фактар кругавой парукі:

> *«Ты можаш быць назіральнікам і гэта ўвогуле немагчыма прыбрацць з беларускага кантэксту – уключаеш тэлевізар, ютуб і бачыш. Ты, хутчэй за ўсё, была пацярпелай ад гвалту ў розных ролях і, хутчэй за ўсё, ты сама была ў ролі гвалтаўніцы (крык, тупат і гэтак далей). І ў гэтым клубку ўзаемаадносінаў, з якіх ты не можаш выбрацца».*

Беларуская супольнасць сфармавалася ў сістэме, дзе важная іерархія сіла і ўлада. Калі не паддаваць гэтыя аспекты рэфлексіі, то яны працягваюць функцыянаваць і нармалізоўвацца. Гэтыя патэрны існавалі ў постсавецкі перыяд, уключаючы гады незалежнасці Беларусі, пачынаючы з 1991 года, а таксама калі да ўлады прыйшоў лукашэнка. Асаблівую ўвагу трэба надаць перыяду кіравання лукашэнкі з 1994 па цяперашні час, калі ў палітычнай рыторыцы сістэматычна прысутнічала легітымізацыя гвалту і прыніжэнне жанчын.[20] Роля жанчын часта вызначалася як абслуговая, з акцэнтам на іх рэпрадуктыўную функцыю.[21] У выніку гэтага шматлікія людзі не ўсведамляюць уздзеянні такіх усталёвак і часта ўспрымаюць іх як натуральную форму камунікацыі.

Важна разумець, што харасмент – гэта не паводзіны асобных людзей, а сукупнасць грамадскіх усталёвак і іерархій, у якіх жанчыны аказваюцца ва ўразлівым становішчы.

Нізкая аплата працы і меншая эканамічная незалежнасць робяць жанчын менш абароненымі ад харасменту, асабліва на працоўным месцы. Магчымасць шантажу, пагрозы страты працы ці рэпутацыі становіцца больш рэалістычнай для тых, хто не можа дазволіць сабе супрацьстаяць сістэме. Як было адзначана раней, некаторыя з апытаных жанчын прапрацавалі даўжэй у арганізацыі, дзе мелі месца выпадкі харасменту з боку наймальніка: «Фінансавы момант вельмі важны. Я не магла знайсці працу, таму працягвала трываць».

Сферы з выяўленай уладай кіраўніцтва над падначаленымі ствараюць умовы для магчымых злоўжыванняў. У творчых калектывах, такіх як тэатр ці кінаіндустрыя, харасмент нярэдка ўспрымаецца як «умова» кар'ернага росту[22]:

> *«На вучобе, на працы гэта ўспрымаецца як умова паспяховай вучобы, кар'еры».*

Жанчыны, якія знаходзяцца ў такіх сітуацыях, часта не ўсведамляюць харасмент як гвалт, пакуль не сутыкаюцца са здрадай ці сур'ёзнымі наступствамі.

---

[20] https://news.zerkalo.io/life/50826.html

[21] https://belta.by/president/view/zhenschina-v-belarusi-dolzhna-rozhat-ne-menee-troih-detej-lukashenko-131069-2010/

[22] Гісторыя Ванштэйна: «Я думаю, усе ўзрушаныя, але не здзіўленыя», – распавяла акторка Рыта Марэна на святочным вечары ў Бэверлі-Хілз, прысвечаным жанчынам на тэлебачанні. 85-гадовая Марэна заклікала жанчын дзяліцца сваімі гісторыямі. Сама яна распавяла, што яе настойлівa перasледаваў дырэктар кінастудыі, калі ёй было 19 гадоў. – https:// www.bbc.com/russian/features-41628071

## Іерархіі і знечалавечванне

Мужчыны, якія здзяйсняюць харасмент, часта перакананыя, што іх дзеянні ўпісваюцца ў межы нормы23. Гэта звязана з глыбока ўкаранёным знечалавечваннем і аб'ектывацыяй жанчын. Калі жанчыну ўспрымаюць не як асобу, а як аб'ект ці сродак для дасягнення асабістых мэтаў, фізічныя ці маральныя межы становяцца размытымі.

Асабліва яскрава гэта праяўляецца ў творчых колах. Існуе перакананне, што «творчым людзям» дазволена ўсё. Жанчына ў такіх колах – толькі «муза», якая павінна натхняць, але як толькі яна «перастане паводзіць сябе правільна», яе меркаванне і асоба становяцца нязначнымі.24 Такія мужчыны часта апраўдваюцца алкаголем ці наркотыкамі: «Я нічога не памятаю», «Гэта было выпадкова». У рэальнасці гэта толькі спроба пазбегнуць адказнасці за свае дзеянні.

## Сацыяльныя стэрэатыпы і роля жанчыны: аснова для дамаганняў

Харасмент цесна звязаны з усталяванымі стэрэатыпамі пра жаночую ролю ў грамадстве. Жанчынаў з дзяцінства ўпэўніваюць, што яны павінны быць «паслухмянымі» і «зручнымі»25. Гэта выхоўвае ілжывую самасць, якая перашкаджае ўменню абараняць свае межы:

> *«Дзяўчынка ўсё робіць правільна, згаджаецца ва ўсім з бацькамі, а потым яна прыходзіць на вучобу, на працу і працягвае быць паслухмянай».*

У выніку жанчынам складаней сказаць «не» або ўсвядоміць, што іх правы парушаныя. Гэта стварае спрыяльную глебу для харасменту, асабліва ва ўмовах, дзе ініцыятыва актара харасменту маскуецца пад «увагу» ці «дапамогу».

## Культура гвалту і нармалізацыя харасменту

Культура гвалту ў грамадстве нармалізуецца з дзяцінства і ахоплівае ўсе сферы жыцця. Выкарыстанне агрэсіі і знявагі ў выхаванні спрыяе фармаванню

---

[23] https://www.nytimes.com/2017/11/10/business/men-at-work-wonder-sexual-harassment.html

[24] https://www.forbes.ru/forbes-woman/433389-vse-hudozhnicy-stoyat-menshe-chem-odin-pikasso-pochemu-zhenshchiny

[25] https://www.unwomen.org/en/news-stories/press-release/2022/06/un-women-reveals-concerning-regression-in-attitudes- towards-gender-roles-during-pandemic-in-new-study

стаўлення да гвалту як да нормы.26 Гэта замацоўвае існыя сістэмы, у якіх харасмент успрымаецца як прымальная з'ява.

## Чаму жанчыны маўчаць пра харасмент?

У «маўчання» ёсць шэраг прычынаў, мы можам вылучыць наступныя:

1. Пачуццё сораму і самабічаванне

Жанчыны, сутыкнуўшыся з харасментам, нярэдка адчуваюць сорам і перакладаюць адказнасць за тое, што адбылося, на сябе:

> *«Я недастаткова змагалася, недастаткова выразна казала "не", напэўна нейк паказала сваімі паводзінамі, што са мной так можна».*

Падобнае самакрытычнае стаўленне да сябе пагаршаецца стэрэатыпамі пра тое, што пацярпелая сама «правакуе» актара харасменту.

2. Страх асуджэння

Страх перад асуджэннем з боку грамадства ці блізкіх таксама замінае жанчынам гаварыць. Адна з рэспандэнтак згадала, што баялася распавесці бацькам пра здарэнне з прычыны:

> *«Тата яго заб'е, а мама – мяне».*

Падобныя ўстаноўкі ўзмацняюць ізаляцыю пацярпелых і дазваляюць гвалтаўнікам заставацца беспакаранымі, а чым больш актараў гвалту застаюцца беспакаранымі, тым вышэй узровень гвалту ў грамадстве.

3. Табуяванасць тэмы

У грамадстве тэма харасменту застаецца табуяванай, у прыватнасці ў выпадках, калі ён звязаны з прафесійным асяроддзем; на гэтую тэму сорамна размаўляць, шмат хто адчувае сябе няёмка. Жанчыны адчуваюць, што іх выбар заўсёды пройгрышны:

> *«Калі адмовішся – страціш нейкае месца пад сонцам, пагодзішся – страціш рэпутацыю, у сваіх вачах упадзеш».*

4. Віктымблэймінг (абвінавачанне пацярпелай)

Грамадства часта перакладае адказнасць за гвалт на жанчын. «Ты

---

[26] Нармалізацыя гвалту на прыкладзе рэпрэсіяў: https://news.zerkalo.io/economics/37141.html

справакавала», «Ты няправільна сябе паводзіла», «Чаму ты не сышла?». Нават самі жанчыны, сутыкаючыся з гвалтам, пачынаюць шукаць прычыну ў сабе. Як прызнаецца адна з пацярпелых: «Калі мяне крытыкуюць, першая думка – гэта я не здолела растлумачыць». Такое стаўленне душыць жаданне размаўляць і шукаць падтрымку.

5. Адсутнасць структурнай падтрымкі

Пацярпелыя не ведаюць, куды звярнуцца па дапамогу. Няма даступных механізмаў, якія маглі б дапамагчы ім абараніць сябе. Нярэдка нават спроба распавесці сваю гісторыю пераўтвараецца ў рэтраўматызацыю: жанчыне даводзіцца зноў і зноў прайграваць сітуацыю, якая траўмуе, сутыкаючыся з асуджэннем і недаверам.

6. Карпаратыўныя сувязі і страх канфліктаў

Многія не хочуць асуджаць калегу-гвалтаўніка, каб «не абвастраць адносіны». Мужчыны ў такіх сітуацыях лічаць за лепшае захоўваць сяброўскія сувязі, паколькі баяцца страціць «лаяльнасць» калектыву. Гэта ўзмацняе атмасферу маўчання.

## Як няроўнасць узмацняе харасмент

Існуе ўзаемасувязь паміж эканамічнай і сацыяльнай уразлівасцямі жанчын і рызыкай харасменту. Важна адзначыць, што фінансавая залежнасць робіць жанчын больш уразлівымі да маніпуляцыяў і пагрозаў на працоўным месцы. Ва ўмовах эміграцыі і страху страты працы, жанчыны застаюцца ў яшчэ больш уразлівым стане. Таксама страх грамадскага асуджэння і табуяванасць тэмы ўзмацняюць маўчанне і беспакаранасць.

Гэтыя фактары ўмацоўваюць сістэму, дзе харасмент становіцца часткай нармалізаваных паводзінаў, што прыводзіць да кругавой парукі гвалту.

## Высновы і рэкамендацыі

На сёння, беларуская грамадзянская супольнасць у эміграцыі знаходзіцца ў працэсе трансфармацыі. Большая частка людзей вымушана эмігравала ў краіны Еўрапейскага саюза, дзе адказнасць за парушэнні правоў чалавека ўскладаецца на дзяржаву. Пры гэтым грамадзянская супольнасць вымушана эмігравала з краіны, у якой гвалт з'яўляецца нормай,27 што наглядна

[27] Прыклады: не прызнанне дзяржавай забойства Міхаіла Пішчэўскага на глебе нянавісці:

рэпрэзентавана масавымі катаваннямі ў 2020 годзе (гл. Расследаванні і справаздачы Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі).28

Паводле справаздачы, многія жанчыны працягваюць сутыкацца з праявамі харасменту ў працоўных і звязаных з імі адносінах. Праявы харасменту маюць шырокі спектр формаў: ад псіхалагічнага ціску ў выглядзе абразаў да сексуалізаванага гвалту.

Жанчыны, якія вымушана эмігравалі і ў дачыненні да якіх здзейснены харасмент, сутыкаюцца з вялікай колькасцю цяжкасцяў у выглядзе адсутнасці прафсаюза, няведання на дастатковым узроўні мясцовай мовы, адсутнасці разумення сваіх правоў і арганізацыяў, дзе можна атрымаць кваліфікаваную дапамогу, а таксама прысутнічае ціск у выглядзе дасягнення «агульнай мэты». Устаноўка «не выносіць бруд з хаты» становіцца яшчэ больш актуальнай, а таксама распаўсюджваецца на шырэйшыя сферы (раней – больш прысутнічала ў сітуацыях хатняга гвалту, цяпер – у працоўных адносінах, валанцёрстве, актывізме і інш.).

З прычыны гэтага, мы лічым важным прыняць наступныя меры:

1. **Прызнанне структурнасці праблемы**

Трэба ўсвядоміць, што харасмент – гэта не праблема асобных людзей, а сістэмная з'ява, укаранёная ў культуру. Важна мяняць грамадскія ўстаноўкі, пераглядаць паняцце нормы: напрыклад, тое, што раней успрымалася як «флірт», павінна ўсведамляцца як гвалт.

Нормы камунікацыі трэба перапісваць на ўсіх узроўнях: ад сям'і да карпаратыўных стандартаў.

2. **Стварэнне механізмаў падтрымкі**

Пацярпелым неабходныя даступныя і празрыстыя сістэмы абароны, такія як:

a. Камітэты па этыцы ў кампаніях. Жанчыны павінны мець магчымасць ананімна паведаміць пра харасмент, а не сутыкацца з асуджэннем калег. Важна адзначыць, што ў падобных структурных падраздзяленнях не павінны прысутнічаць людзі, якія здзяйсняюць ці здзяйснялі харасмент, а таксама павінен быць захаваны гендарны баланс, каб жанчыны пачуваліся больш бяспечна, заяўляючы пра харасмент.

---

https://www.bbc.com/russian/ international/2015/10/151027_belarus_gay_murder

Непрызнанне дзяржавай нападу на беларускага рэжысёра на глебе нянавісці: https://euroradio.fm/u-minsku-nevyadomy- napau-na-lgbt-kampaniyu-adzin-pacyarpely-u-shpitali

Публічная рыторыка пра «месца жанчын»: https://news.zerkalo.io/economics/41542.html

Адмова ад прыняцця законапраекта аб супрацьдзеянні хатняму гвалту: https://belta.by/president/view/lukashenko-zhestko- raskritikoval-zakonoproekt-o-protivodejstvii-domashnemu-nasiliju-320484-2018/

[28] https://torturesbelarus2020.org/

b. Юрыдычныя і псіхалагічныя сервісы. Падтрымка павінна быць лёгка даступнай, шырока рэкламаванай, бясплатнай, ананімнай і канфідэнцыйнай.

### 3. Інфармацыйныя кампаніі

Правядзенне і ўдзел у інфармацыйных кампаніях, прысвечаных недапушчальнасці харасменту як аднаго з відаў гвалту ў дачыненні да жанчын. Так, напрыклад, ёсць міжнародная кампанія «16 актыўных дзён супраць гендарнага гвалту»[29].

### 4. Прыцягненне ўвагі да праблемы і тлумачэнне яе прыроды.

Напрыклад, важна тлумачыць, чаму дотык да чалавека без яго згоды, у тым ліку выпадкі, калі гэта ўспрымаецца ў грамадстве як «камплімент», з'яўляецца формай гвалту. Матэрыялы ў медыя павінны публікавацца з акцэнтам на недапушчальнасць харасменту як паводзінаў і што асобныя формы харасменту кваліфікуюцца як злачынства. Стварэнне прэцэдэнтаў.

Пакаранне за харасмент павінна быць не толькі справядлівым, але і публічным. Гэта прадэманструе грамадству, што праблема важная, і гвалт не застанецца беспакараным. Прэцэдэнты ствараюць культуру нулявой талерантнасці да гвалту.

### 5. Інфармаванне грамадскасці

Грамадства павінна даваць пацярпелым бяспечныя прасторы для агучвання сваіх гісторыяў. Публічнае абмеркаванне тэмы дазволіць жанчынам зразумець, што яны не адны, тое, што адбылося, не з'яўляецца іх віной, і гэта не «асабістая трагедыя», а масавая праблема. Так, напрыклад, «Марш памяці Лізы» стаў своеасаблівым штуршком для масавай заявы пра гвалт у дачыненні да жанчын.

Важна пачаць адкрыта гаварыць пра харасмент, ствараць прасторы для абмеркавання і празрыстыя механізмы абароны. У адваротным выпадку гвалт працягне заставацца нормай для большасці. Толькі шматгалоссе і структурны падыход могуць дапамагчы пацярпелым, а таксама знізіць талерантнасць да гвалту.

Таксама варта адзначыць, што абарона правоў чалавека ўключае ў сябе абарону правоў жанчын. Гендарная дыскрымінацыя з'яўляецца парушэннем правоў чалавека, а харасмент, у патрыярхальным грамадстве – формай гендарнай дыскрымінацыі, а часам – нават гендарна абумоўленым гвалтам. З прычыны гэтага варта памятаць, што абарона правоў чалавека напрамую звязаная з абаронай правоў жанчын.

---

[29] https://eca.unwomen.org/ru/what-we-do/ending-violence-against-women/16-days-of-activism



© **Прававая ініцыятыва**, 2024